[6] Б а р т Р. // Избранные работы. Семиотика. Поэтика. М., 1989. С. 418.
[7] См.: E c o U. The Aesthetics of Chaosmos: The Middle Ages of James Joyce. Harvard, 1989.
[8] Э к о У. Имя розы. С. 455.
[9] R o b e y U. // Eco U. The Open Work. Harvard, 1989. P. XXX.

В. Ф. ШАЛЬКЕВІЧ

# ФІЛАСОФІЯ КАНТА Ў БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст.

У першай трэці XIX ст. у Беларусі і Літве пачалося асэнсаванне дасягненняў нямецкай класічнай філасофіі, і ў першую чаргу філасофіі І. Канта. Успрыняцце духоўнай спадчыны роданачальніка нямецкага ідэалізму пачалося з яго сацыяльна-палітычных ідэй. Адным з тых, хто першым па вартасці ацаніў сацыяльна-палітычную філасофію кёнігсбергскага мысліцеля як сістэму ідэй буржуазнага лібералізму, накіраваную на вызваленне асобы ад гнёту феадалізму, дэспатызму і царквы, быў ураджэнец Слонімшчыны, непасрэдны слухач і вучань Канта Іосіф Быхавец (1778 — 1845).

Былы студэнт Галоўнай школы Вялікага княства Літоўскага, удзельнік паўстання Т. Касцюшкі (1794) І. Быхавец, пасля падаўлення паўстання, ратуючыся ад рэпрэсій, апынуўся ў Кёнігсбергу, дзе слухаў апошнія лекцыі кёнігсбергскага мудраца. (З 1796 г. 72-гадовы Кант, як вядома, спыніў выкладчыцкую дзейнасць). Будучы ў Кёнігсбергу, Быхавец пераклаў на польскую мову і выдаў у 1796 г. толькі што выйшаўшы там трактат Канта «Да вечнага міру» (1795), у якім выказваліся гуманістычныя ідэі ўстанаўлення «вечнага міру» паміж народамі. Мір, паводле Канта, можа быць устаноўлены паміж дзяржавамі з дэмакратычнымі формамі праўлення, у якіх ажыццёўлена раздзяленне ўлад (г. зн. ажыццёўлена аддзяленне выканаўчай улады ад заканадаўчай), а таксама пры ўмове стварэння ўсеахопліваючай федэрацыі самастойных раўнапраўных дэмакратычных дзяржаў, наладжаных па рэспубліканскаму тыпу. Залогам утварэння такога саюза павінны служыць асвета, маральнае выхаванне, эканамічнае супрацоўніцтва народаў, разважнасць кіраўнікоў[1].

У 1799 г. Быхавец пераклаў на польскую мову і таксама выдаў у Кёнігсбергу яшчэ адзін твор Канта «Ідэі гісторыі ў сусветна-грамадзянскім плане», у якім даказвалася заканамернасць сацыяльнага прагрэсу, дзякуючы распаўсюджванню ведаў і пераадоленню забабонаў, асуджаліся феадальныя парадкі, што супярэчаць розуму чалавека. Сваімі перакладамі работ І. Канта на польскую мову І. Быхавец садзейнічаў прапагандзе ідэй палітычнага лібералізму. Яго перакладчыцкая, выдавецкая і каментатарская дзейнасць ішла ў адным напрамку з памкненнямі прыхільнікаў ліберальных ідэй у Беларусі і Літве, жаданым ідэалам для якіх была прававая форма арганізацыі дзяржавы з падзелам улад.

Разам з І. Быхаўцом высока цаніў філасофію кёнігсбергскага мысліцеля Енджэй Снядзецкі — брат Яна Снядзецкага, прафесар хіміі Віленскага універсітэта, які лічыў, што «ў вучоным свеце Кант заслужана набыў сабе бессмяротную славу»[2].

Ацэнку Е. Снядзецкага падзяляў куратар Віленскай вучэбнай акругі князь А. Чартарыскі, а таксама рэктар універсітэта І. Страйноўскі, якія вырашылі запрасіць на кафедру філасофіі ў Вільна каго-небудзь з вядомых кантыянцаў. Выбар выпаў на прафесара філасофіі Эрлангенскага універсітэта І. Г. Абіхта (1762 — 1816), якога А. Чартарыскаму рэкамендаваў акадэмік Пецярбургскай Акадэміі навук матэматык М. І. Фус (1755 — 1825). Да гэтага часу Абіхт быў ужо вядомы сваёй працай, што атрымала прэмію Берлінскай Акадэміі навук, «Прагрэс метафізікі ад Лейбніца да Вольфа» (1796), напісанай у духу трансцэндэнтальнага ідэалізму. У 1804 г. Абіхт прыбыў у Вільна. На працягу дванаццаці гадоў ён выкладаў тут логіку, метафізіку, этыку, псіхалогію, уводзіны ў філасофію.

Дзейнасць І. Г. Абіхта ў Вільні супала з часам рэктарства (1807 — 1815) і актыўнай навуковай і педагагічнай дзейнасці Яна Снядзецкага, прыхільніка дэізму і сенсуалізму французскага Асветніцтва, перакананага праціўніка апрыярызму і агнастыцызму І. Канта. Так, у пісьме да Т. Чацкага (1806) Я. Снядзецкі характарызаваў Канта як «сімптом параксізму і праяўленне сапраўднай заразы чалавечага розуму». У 1814 — 1821 гг. ім быў апублікаваны шэраг работ («Аб метафізіцы», «Аб філасофіі» і інш.), у якіх філасофія Канта называлася «метафізічным містыцызмам», да якога непрыдатна «салідная назва — філасофія»[3].

Дэталёвы аналіз крытыкі Я. Снядзецкім І. Канта дадзены ў работах Э. К.

Дарашэвіча, дзе, між іншым, разам з вартасцю адзначаны і істотныя недахопы гэтай крытыкі [4]. Дарашэвіч Э. К., у прыватнасці, піша, што «правільна крытыкуючы кантаўскі апрыярызм, схематызм, суб'ектыўна-ідэалістычныя тэндэнцыі, Я. Снядзецкі не прызнаваў у Канта нічога станоўчага, не бачыў каласальнай каштоўнасці пошукаў дынамічнасці, дыялектычнасці сусветных працэсаў, у тым ліку і ў тэорыі пазнання»[5]. Ацэнка беларускага даследчыка супадае з меркаваннем аўтарытэтнейшых польскіх гісторыкаў філасофіі — У. Татаркевіча, Г. Струве і інш.[6] Прызнаючы, такім чынам, змястоўнасць і актуальнасць крытыкі Канта Янам Снядзецкім, нельга не згадзіцца з вышэйпамянёнымі даследчыкамі ў тым, што яна мела аднабаковы і абмежаваны характар і спалучаючыся з высокім навуковым аўтарытэтам Яна Снядзецкага, перашкаджала правільнай, усебаковай ацэнцы філасофіі кёнігсбергскага мысліцеля. Адбілася яна і на дзейнасці Абіхта, якому ўдалося захаваць месца толькі дзякуючы падтрымцы А. Чартарыскага.

Пад націскам Я. Снядзецкага І. Г. Абіхт паспрабаваў змякчыць крайнасці кантаўскага апрыярызму і агнастыцызму, аб чым сведчыць змест яго працы «Уводзіны ў філасофію», выдадзенай у 1814 г. на лацінскай мове ў Вільні і прысвечанай акадэміку Мікалаю Фусу[7]. Аднак пастаянная канфрантацыя Я. Снядзецкага і І. Абіхта не магла абудзіць у слухачоў лекцый апошняга і сучаснікаў асаблівы інтарэс да філасофіі Канта. Тым не менш яго выкладчыцкая дзейнасць не прайшла бясследна. З ліку вучняў Абіхта выйшлі вядомыя філосафы свайго часу, прапагандысты ідэйнай спадчыны нямецкага мысліцеля. У прыватнасці, яго вучань К. Л. Шырма стаў прафесарам філасофіі Варшаўскага універсітэта (1824 — 1831).

Побач з К. Л. Шырмам пэўную ролю ў прапагандзе духоўнай спадчыны І. Канта ў Беларусі і Літве, у прыватнасці, яго педагагічных поглядаў адыграў другі вучань Абіхта, выпускнік Віленскага універсітэта Ян Баброўскі (1777 — 1823). Ён пераклаў і выдаў у Вільні ў 1819 г. працу І. Канта «Аб педагогіцы», у якой нямецкі мысліцель праводзіў ідэю змякчэння ўплыву царквы на выхаваўчы працэс. У ёй, у прыватнасці, Кант, педагагічныя погляды якога знаходзіліся пад значным уплывам Ж.-Ж. Русо, салідарызаваўся з французскім асветнікам у тым, што рэлігійнае выхаванне трэба пачынаць не з дзіцячага, а хутчэй, з юнацкага ўзросту, паколькі дзеці не могуць скласці сабе належнага разумення пра бога, а значыць, усвядоміць свае абавязкі перад ім. Таму неабходна спачатку азнаёміць дзяцей з абавязкамі чалавека, яго назначэннем, умацаваць у іх сілу разважання, даць ім неабходныя звесткі аб сусвеце і толькі пасля гэтага раскрыць ім паняцце аб вышэйшай сутнасці. Гэтыя ідэі вынікалі з мэт выхавання, якое, паводле Канта, павінна весці чалавечы род да дасканаласці, развіваць яго прыроду, садзейнічаць выкананню чалавекам яго прызначэння.

Выданне Я. Баброўскага было забяспечана прадмовай перакладчыка, заўвагамі, а таксама біяграфічнымі звесткамі, узятымі з кнігі французскага даследчыка Шарля Вілера «Трансцэндэнтальная філасофія Канта» (1801), якія поўнасцю расходзіліся з ацэнкай Канта Янам Снядзецкім. «Было б поўнай памылкай лічыць Канта толькі метафізікам, таму што ён быў таксама матэматыкам, астраномам, хімікам, займаўся прыродазнаўчай гісторыяй, фізіялогіяй, мовамі, мастацтвам... Усё, што пісаў філосаф, было істотна, таму што служыла ўдасканаленню нашых здольнасцей, маралі, прагрэсу чалавецтва»[8].

Артадаксальным паслядоўнікам Канта быў іншы вучань І. Г. Абіхта, які пасля заканчэння Віленскага універсітэта асеў на Случчыне (1817), магістр філасофіі Л. Развадоўскі. Ён прысвяціў усё сваё свядомае жыццё вывучэнню і каменціраванню філасофіі Канта. Пасля яго смерці (1869) засталося некалькі рукапісаў, важнейшы з якіх — «Філасофская сістэма Канта» — да 1905 г. захоўваўся ў бібліятэцы Слуцкай гімназіі. Далейшы лёс гэтага рукапісу пакуль невядомы.

Да ліку яўных праціўнікаў Канта адносіўся ўраджэнец Магілёўшчыны Аніол Даўгірд, наступнік Абіхта па кафедры філасофіі Віленскага універсітэта, аўтар фундаментальнага «Трактата аб уласцівых мысленню правілах ці логіка тэарэтычная і практычная» (Полацк, 1828), у якім праводзіцца паслядоўны крытычны аналіз «Крытыкі чыстага розуму», яе асноўных частак — трансцэндэнтальнай эстэтыкі, трансцэндэнтальнай аналітыкі і трансцэндэнтальнай дыялектыкі. Менавіта ў гнасеалогіі Канта Даўгірд выявіў найбольш слабыя моманты яго суб'ектыўна-ідэалістычнай філасофіі. Ён падышоў да разумення адной з асноўных супярэчнасцей сістэмы І. Канта — дапушчэнню ноуменаў і, па сутнасці, адмаўленню іх існавання па-за пачуццём і свядомасцю[9].

З іншых, кансерватыўных пазіцый змагаліся з Кантам прафесары Полацкай езуіцкай акадэміі. Яны крытыкавалі нямецкага мысліцеля за тое, што ў сваёй галоўнай працы — «Крытыцы чыстага розуму» — ён паслядоўна абвергнуў усе асноўныя доказы быцця бога — анталагічнае, касмалагічнае, тэалагічнае — і

прыйшоў да яўна мяцежнага вываду аб тым, што «рацыянальная тэалогія» як тэарэтычная навука немагчыма і як такая не мае права на існаванне. Калі ўлічыць, што ў Полацкай езуіцкай акадэміі функцыянаваў тэалагічны факультэт, то падобныя меркаванні Канта мелі, несумненна, злабадзённы характар, і менавіта таму яны выклікалі такую негатыўную рэакцыю каталіцкіх артадоксаў.

У пачатку 20-х гадоў XIX ст. у Беларусі і Літве пачалося знаёмства з філасофіяй Шэлінга. Вяшчальнікам ідэй філасофскага рамантызму выступіў Ю. Галухоўскі (1797 — 1858), фундаментальна адукаваны філосаф, вучань і прыяцель Шэлінга. Вядомасць яму прынёс прысвечаны Шэлінгу і выдадзены ў 1822 г. у Эрлангене на нямецкай мове твор «Філасофія і яе адносіны да жыцця цэлых народаў і асобных людзей» (у 1834 г. перакладзены Д. М. Вяланскім на рускую мову). Гэтая праца і паслужыла падставай для запрашэння Ю. Галухоўскага на кафедру філасофіі ў Віленскі універсітэт, дзе яго выкладчыцкая дзейнасць працягвалася вельмі недоўгачасна (з восені 1823 па люты 1824 г.). Сутнасць яго лекцый, што карысталіся незвычайнай папулярнасцю ў слухачоў, у тым, што філасофія заклікала дапамагчы людзям у разуменні свету як гарманічнай боскай цэласнасці, у пошуках сувязей з творчымі сіламі прыроды і пераадолення такім чынам сацыяльнага атамізму. Кожны народ павінен мець сваю нацыянальную філасофію, а сапраўдны філосаф з'яўляецца органам народнай самасвядомасці, што мае права ў сваім імкненні да ісціны не лічыцца з застыўшымі традыцыямі і меркаваннем большасці. Індывіду філасофія павінна даць «цэласны погляд на свет», пачуццё адзінства з народам і сусветам, без чаго немагчыма станаўленне асобы. Нягледзячы на сваю папулярнасць, а, можа, і насуперак ёй, Галухоўскі пасля завяршэння судовага працэсу над філаматамі разам з іншымі папулярнымі прафесарамі (Баброўскім, Данілевічам, Лелевелем) быў пазбаўлены кафедры нібыта на падставе «дрэннага ўплыву на моладзь».

Закрыццё самадзяржаўем галоўных навуковых цэнтраў крытыкі Канта «злева» і «справа» (Віленскага універсітэта ў 1832 і Полацкай езуіцкай акадэміі ў 1820), з аднаго боку, выкладчыцкая дзейнасць Ю. Галухоўскага, з другога, садзейнічалі змяншэнню ў Беларусі цікавасці да філасофіі Канта і абуджэнню павышанай увагі спачатку да ідэй Шэлінга, а потым (у 30 — 40-я гг. XIX ст.) — Гегеля. Такім чынам, пік навуковага ўспрыняцця філасофіі Канта на Беларусі прыпадае на першую трэць XIX ст. Палеміка, што вялася вакол філасофіі Канта ў гэты час, садзейнічала развіццю філасофскай думкі Беларусі, умацаванню ліберальнага напрамку грамадскай думкі, аслабленню ўплыву тэалогіі. Гэтая незаслужана забытая старонка нацыянальнай гісторыі філасофіі, несумненна, патрабуе пільнай увагі даследчыкаў.

[1] Галоўныя ідэі трактата І. Канта «Да вечнага міру» аўтарам гэтага артыкула выкладаліся на Усесаюзнай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 250-годдзю І. Канта (Калінінград, красавік 1974). Надрукаваны ў дадатку да зборніка «Вопросы теоретического наследия Иммануила Канта» (Калінінград, 1977, с. 132 — 137) — рэфератыўны пераказ Д. І. Грышына.

[2] Ś n i a d e c k i J. Dzieła. Warszawa, 1840. T. 3. S. 269.

[3] Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей. М., 1956. Т. 1. С. 631.

[4] Гл.: Д о р о ш е в и ч Э. К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Мн., 1971. С. 80 і далей.

[5] Там жа. С. 87.

[6] Гл.: Historia Nauki Polskiej. Wrocław; Warszawa etc., 1977. T. 3. S. 361.

[7] Гл.: A b i c h t I. H. Initia philosophiae proprie sic dictae. Vilnae, 1814. P. 11.

[8] K a n t I. O pedagogice. Wilno, 1819. S. VII, VI.

[9] Гл.: Д о р о ш е в и ч Э. К. Аниол Довгирд — мыслитель эпохи Просвещения. Мн., 1967. С. 173 — 174.

Т. І. ГЛУШАКОВА

## КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ АБРАЗАПІСАННЯ (XI — XVI стст.)

Культурная з'ява, што ўвайшла ў навуковы ўжытак пад назвай «беларускі абраз» — яскравае сведчанне творчых намаганняў і адкрыццяў нашых шматлікіх продкаў, але і ў роўнай меры — адкрыццё сучасных беларускіх даследчыкаў, «доўгачаканая нечаканасць»[1], якая мусіць узнавіць духоўныя каштоўнасці.

Не заглыбляючыся ў пытанне пачатку гісторыі абразапісання, трэба адзначыць, што гэтая галіна традыцыйнага мастацтва на беларускіх землях пачала развівацца гэтаксама, як і ў шмат іншых хрысціянскіх краінах, маючы ў якасці падмурку добравядомы і распаўсюджаны візантыйскі стыль. Магутная духоўная візантыйская традыцыя, найбольш характэрнымі рысамі якой сталі дыдактыч-